© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819–3625 №15(2), 2010

Віктар Кавалёў

# Тэорыя і метадалогія асобнай кафедры

Решетников, С.В. (2009). *Политическая наука в БГУ: теоретико-методологические и прикладные аспекты*. Минск: БГУ. 175 с.

Паводле афармлення выданне выглядае навуковым, што пацвярджаюць адпаведны надпіс на апошняй старонцы і наяўнасць двух рэцэнзентаў: доктара філасофскіх навук Льва Крыштаповіча і доктара гістарычных навук Алега Бухаўца. Але пры гэтым цяжка было б сфармуляваць анатацыю, якая б яшчэ менш адлюстроўвала змест. Кніга відавочна не раскрывае «сучаснага этапу развіцця паліталогіі ў Рэспубліцы Беларусь», яна ў прынцыпе прысвечаная іншаму. Больш дакладная назва магла б гучаць наступным чынам: «Кафедра паліталогіі БДУ: арганізацыйныя і метадычныя дакументы». Паводле свайго характару выданне хутчэй прэзентацыйнае і можа быць цікавае галоўным чынам для супрацоўнікаў кафедры, выпускнікоў і, магчыма, абітурыентаў, а не для *спецыялістаў у галіне палітычных навук, а таксама практыкуючых палітыкаў* (с. 4). Аўтарскага тэксту там практычна няма (толькі невялікія ўводзіны), і асноўнае месца займаюць дакументы вельмі рознага характару і прызначэння.

Структура кнігі апісваецца наступным чынам: «*У першай главе разглядаюцца пытанні, звязаныя з развіццём паліталогіі як навучальнай дысцыпліны і дысцыпліны спецыялізацыі; у другой главе – праблемы развіцця паліталогіі як навуковай галіны, як галіны падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У кнізе ўтрымліваюцца звесткі пра прадстаўнікоў паліталагічнай супольнасці Беларусі, інфармацыя пра выпускнікоў кафедры паліталогіі БДУ, абароненыя дысертацыі за апошнія 16 гадоў*» (с. 4). Але гэта не зусім дакладна адлюстроўвае змест.

У кнізе можна знайсці цэлую калекцыю метадычных матэрыялаў: апісанне кваліфікацыйнай характарыстыкі «палітолаг-юрыст», планы навучальных курсаў і нават спіс тэмаў курсавых і дыпломных праектаў на дзесяці старонках (с. 56–66). Уся гэтая спецыфічная і вузкаспецыялізаваная інфармацыя складае першую главу працы.

Другую главу адкрываюць два інтэрв'ю ўкладальніка,[1] загадчыка кафедры паліталогіі БДУ Сяргея Рашэтнікава: газеце «Звязда» (1997) і перыёдыку «Проблемы управления» (2002). Пасля ізноў ідуць метадычныя матэрыялы, якія раскрываюць змест навучальных праграмаў паліталогіі. У главе таксама змешчаныя дакументы, звязаныя з даследчаю і навуковаю дзейнасцю: заяўка на атрыманне фінансавання ад Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, анкета навуковай школы кафедры паліталогіі БДУ, статутныя дакументы Беларускай акадэміі палітычных навук (грамадскае аб'яднанне, створанае ў 1990-я гг.), інфармацыя аб працы саветаў па абароне дысертацыяў. Напрыканцы падаюцца кароткія біяграфічныя звесткі прадстаўнікоў паліталагічнае супольнасці Беларусі, як яе вызначае ўкладальнік, і спіс выпускнікоў кафедры паліталогіі БДУ з 1997 да 2007 г.

Выданне пакідае вельмі дзіўнае ўражанне. З аднаго боку, кніга ўтрымлівае матэрыял, на падставе якога можна аналізаваць развіццё палітычнай навукі Беларусі (дакладней, аднаго яе сегменту), але пры гэтым змешчаныя дакументы разнародныя, часта малаінфарматыўныя і бюракратычныя, з яўным ухілам у навучальны працэс, а публікацыя шэрагу матэрыялаў выклікае здзіўленне. Акрамя гэтага, далёка не заўсёды пазначаецца дата складання дакументаў, у які перыяд і для каго яны мелі сілу.

Калі змешчаная інфармацыя адэкватна адлюстроўвае працу кафедры, то вынікі яе дзейнасці падаюцца вельмі аднабаковымі: складаецца адчуванне (якое цалкам пацвярджаецца падрабязным аналізам тэкстаў), што кафедра ўстойліва функцыянуе выключна як метадычная і адукацыйная ўстанова. Шкада, бо ў 1990-я гг. на кафедру і супольнасць, якая паўставала вакол яе, ускладаліся вялікія акадэмічныя надзеі.

Дэталёвы аналіз апублікаваных у кнізе дакументаў дазваляе скласці пэўнае ўражанне пра развіццё палітычнае адукацыі ды навукі на кафедры паліталогіі БДУ, яе логіку і акадэмічны стыль. Пакідаючы па-за ўвагай адукацыйныя аспекты – як другасныя для вызначэння акадэмічнага статусу ўстановы – звернем асаблівую ўвагу на наступныя істотныя моманты: апісанне месца і ролі кафедры ў паліталагічнай супольнасці Беларусі ды развіццё і кірункі навуковае дзейнасці.

Першае, што кідаецца ў вочы: логіка кнігі цалкам выключае з поля «палітычнай навукі» БДУ міжнародныя адносіны (адпаведны факультэт і кафедры), паліталогію на гістарычным факультэце, а таксама іншыя формы даследавання (выкладання) палітыкі. Палітычная навука ў БДУ, на думку Рашэтнікава, раўняецца кафедры паліталогіі, цягам усёй кнігі падкрэсліваецца выключнасць і ўнікаль-

[1] У звязку з тым, што аўтарскага тэксту ў кнізе практычна няма (яна складаецца пераважна з дакументаў), нам падаецца больш правільным весці размову не пра аўтара, а пра ўкладальніка выдання.

насць кафедры. Больш за тое, часам ствараецца ўражанне, што кафедра паліталогіі БДУ, паліталогія ў БДУ і паліталогіі ў Беларусі ў цэлым – гэта адное і тое ж. Праўда, з іншых публікацыяў супрацоўнікаў кафедры можна даведацца, што ў Беларусі склаліся дзве школы паліталогіі: адпаведная кафедра БДУ і Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце (Решетников и др., 2009). Сума гэтых дзвюх школаў, трэба думаць, ужо амаль на 100% мусіць складаць беларускую паліталогію.

Такое вузкае кола дысцыпліны ў дзесяцімільённай краіне можа выклікаць сум, але, здаецца, супрацоўнікам кафедры яно толькі дадае адчування выключнасці і ўнікальнасці. Як бачна, сюды нават не трапляюць значныя дзяржаўныя асяродкі, якія належаць да political science у звычайным значэнні. Пра недзяржаўныя цэнтры размовы няма ў прынцыпе.

Асаблівай увагі ў звязку з гэтым заслугоўвае акрэсленне ў кнізе паняцця «паліталагічная супольнасць». «*Кніга ўтрымлівае звесткі аб прадстаўніках паліталагічнае супольнасці Беларусі*» (с. 4). Такім чынам пазначаецца ў прадмове задача, якой прысвечаны адмысловы раздзел (с. 148–170). Дык як выглядае паліталагічная супольнасць Беларусі, хто ў яе трапляе і на якіх падставах? Па-першае, выданне ўключае ў яе ўсіх дактароў палітычных навук, якія абараніліся ў БДУ, незалежна ад таго, ці звязаныя яны з кафедраю і ці займаюцца навуковаю дзейнасцю. У пералік уваходзіць нават Вячаслаў Агееў з Калінінградскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэту (Расія), для якога Беларусь – гэта толькі месца абароны дысертацыі.

Акрамя дактароў навук у паліталагічную супольнасць Беларусі трапляюць усе выкладчыкі кафедры паліталогіі – ад прафесараў да асістэнтаў, незалежна ад наяўнасці ступені, публікацыяў і досведу працы. Дактары і выкладчыкі дапаўняюцца заснавальнікам кафедры паліталогіі Аляксандрам Байчоравым і невялікаю дадатковаю групай асобаў: Алена Дастанка (факультэт міжнародных адносінаў БДУ), Уладзімір Падкапаеў (Нацыянальная акадэмія навук Беларусі) і Аляксандр Дарашэнка (Еўразійская сетка палітычных даследаванняў). Першыя двое ўвайшлі ў гэты спіс, відавочна, на падставе таго, што іхным навуковым кіраўніком быў Сяргей Рашэтнікаў. Гэтым склад беларускай паліталагічнай супольнасці абмяжоўваецца. Гэта значыць, істотная частка, калі не большасць, навукоўцаў, якія працуюць у дысцыпліне political science, проста не згадваецца. Гэта ў поўнай ступені датычыць як дзяржаўных, так і недзяржаўных навучальных і даследчых інстытуцыяў. Што, у прынцыпе, адпавядае логіцы ўнікальнасці і цэнтральнасці кафедры паліталогіі БДУ, у адпаведнасці з якой складзенай кніга.

Прэзентацыя навуковай дзейнасці ў выданні выглядае таксама вельмі дзіўна, прынамсі значных відавочных вынікаў такой працы не дэманструецца – і гэта ва ўстанове, якая прэтэндуе на статус «школы» і асноўнага цэнтру палітычнай навукі ў Беларусі.

Стан даследчай дзейнасці можна ацаніць на аснове «Анкеты навуковай школы ў галіне палітычных навук» (такая школа, як сцвярджаецца, склалася на кафедры паліталогіі БДУ). Дакумент датуецца 29 лістапада 2006 г. Асноўныя даследчыя кірункі фармулююцца наступным чынам: сацыяльна-палітычныя аспекты палітычных даследаванняў, методыка і тэхніка палітычных даследаванняў, параўнальныя даследаванні палітычных сістэмаў (с. 115). Але, як падаецца, збольшага гэты спектр застаецца дэкларатыўным.

Напрыклад, п. 17 (с. 120–121) паказвае, што за пяць гадоў працы школы (2001–2006 гг.) выйшлі дзесяць манаграфіяў, дзесяць падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, дваццаць чатыры метадычныя дапаможнікі ды чатыры навучальныя праграмы дысцыплінаў. Такім чынам, уласна навуковая прадукцыя складае дзесяць манаграфіяў (у сярэднім дзве манаграфіі на год), пры гэтым колькасны склад школы – сорак чалавек. Калі паглядзець на спіс асноўных публікацыяў за апошнія пяць гадоў, то ён пакідае яшчэ больш дзіўнае ўражанне. Пералік уключае дзевяць пазіцыяў, пры гэтым дзве манаграфіі напісаныя расійскім аўтарам, Вячаславам Агеевым (Агеев, 1997; Агеев, 2001). Акрамя гэтага дзве кнігі са спісу былі напісаныя ў 1996 г. (Землякоў, 1996a; Землякоў, 1996b), такім чынам, у 2001–2006 гг. сорак навукоўцаў школы выдалі толькі пяць манаграфіяў. Больш за тое, калі выключыць са спісу кнігі, што выйшлі ў 2001 г. і відавочна былі напісаныя да пачатку наступнай «пяцігодкі», манаграфіяў застанецца дзве (Решетников, 2003; Матусевич, 2005). Лічбы, калі яны адпавядаюць рэчаіснасці, проста шакуюць.

Не менш праблемным выглядае і такі важны пункт, як удзел у арганізацыі навуковых канферэнцыяў, што адлюстроўваецца ў п. 23 «Арганізацыя навуковых мерапрыемстваў і семінараў (у тым ліку і для маладых навукоўцаў) па тэматыцы навуковай школы» (с. 123–124). Тут пазначаныя дзве канферэнцыі ў Горадні, адна ў Екацерынбурзе і адна ў Маскве. Ніводнай канферэнцыі ў Менску на базе кафедры, ніводнай за пяць гадоў.

Калі казаць пра акадэмічнае прызнанне школы, то яно звязанае выключна з адукацыйнаю дзейнасцю. У кнізе называюцца толькі прэмія за развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі (Сяргей Рашэтнікаў у 2002 г.) і дзве прэміі за падрыхтоўку пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх працаў (Алена Грэчнева і Таццяна Салавей у 2006 г.).

Узровень прысутнасці «школы» ў навуковых радах акадэмічных часопісаў, калі верыць апублікаванай інфармацыі, таксама дастаткова нізкі. А гэта дастаткова істотны паказнік прызнання (калі не навукова-даследчага, то прынамсі акадэмічна-бюракратычнага) з боку больш шырокай супольнасці калегаў з розных дысцыплінаў і ўстановаў. З усіх сарака супрацоўнікаў толькі два – Сяргей Рашэтнікаў і Леанід Землякоў – уваходзяць у склад навуковых радаў. Пры гэтым Рашэтнікаў пазначаны як сябра рады шасці выданняў, а Зем-

лякоў – двух. У саветы па абароне дысертацыяў уваходзяць тры прадстаўнікі школы.

У звязку з гэтым дастаткова цікава выглядае дынаміка прадстаўніцтва розных дысцыплінаў у савеце па абароне дысертацыяў на наданне навуковай ступені доктара палітычных навук (с. 126–129). Прадстаўніцтва дактароў філасофскіх, гістарычных, юрыдычных, сацыялагічных і палітычных навук тут змянялася на працягу апошніх дваццаці гадоў (гл. табл. 1).

**Табліца 1. Склад навуковага савету па абароне доктарскіх дысертацыяў па палітычных навуках*, 1991–2009 гг. (складзена рэцэнзентам)***

| | 1991–1995 | 1997–2001 | 2001–2006 | 2006–2009 |
|---|---|---|---|---|
| Дактары палітычных навук | 0 | 1 | 2 | 5 |
| Дактары сацыялагічных навук | 2 | 3 | 3 | 0 |
| Дактары філасофскіх навук | 6 | 6 | 4 | 5 |
| Дактары гістарычных навук | 3 | 4 | 3 | 4 |
| Дактары юрыдычных навук | 3 | 0 | 0 | 0 |

*У склад савету звычайна ўваходзіць адзін кандыдат навук, які выконвае сакратарскія функцыі. У нашых падліках ён прыраўноўваецца да доктара.

Паказальным уяўляецца знікненне з савету пасля 1995 г. дактароў юрыдычных навук, нягледзячы на тое што ў 1994 г. кафедра паліталогіі стала часткаю менавіта юрыдычнага факультэту. Гэта ўскосна сведчыць, што істотнай акадэмічнай супрацы з юрыстамі не атрымалася. Прадстаўніцтва гісторыкаў – тры–чатыры чалавекі. Самаю значнаю групаю у гістарычнай перспектыве выступаюць філосафы, якія маюць чатыры–шэсць прадстаўнікоў. Напэўна, гэтыя дысцыпліны, з перавагаю філасофіі, можна лічыць асноўнымі акадэмічнымі «партнёрамі» паліталогіі БДУ, што асабліва паказальна на фоне знікнення з савету сацыёлагаў. Адметна і тое, што доля дактароў палітычных навук паступова расце, хоць пакуль яшчэ ніжэйшая за палову.

У выданні адзначаецца, што даследаванні кафедры на 90 % маюць фундаментальны характар, а рэшта – дастасоўны (прыкладны). Але што гэта за даследаванні, застаецца нявысветленым. Цяжка зразумець, у чым заключаецца гэтая фундаментальнасць. Калі гэта распрацоўванне асобных тэарэтычных кірункаў, то як можна сфармуляваць тэарэтычныя здабыткі? Ці ўсё завяршаецца напісаннем падручнікаў і складаннем навучальных праграмаў для студэнтаў? Ці можна вызначыць нейкі даследчы профіль кафедры як акадэмічнай інстытуцыі? Адказы на гэтыя пытанні дастаткова складаныя, а дакументы, прадстаўленыя ў кнізе, іх не даюць.

Выключэннем уяўляецца змешчаная ў кнізе заяўка на грант у Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў. Застаецца толькі шкадаваць, што практыка пу-

блікаваць грантавыя заяўкі не вельмі распаўсюджаная, а змешчаны ў кнізе прыклад – адзінкавы. Было б цікава паглядзець на правілы і аргументацыю пры атрыманні фінансавання ад дзяржаўных фондаў.

Адлюстраваны ў заяўцы праект мае назву «Метадалогія і метады аналізу публічнай палітыкі», асноўныя выканаўцы – Сяргей Рашэтнікаў, Ядвіга Яскевіч, Ніна Антановіч і Алена Дастанка, а сам праект датаваны ажно 1998 г. Калі ўлічыць, што друкуецца ён у кнізе, якая выйшла ў 2009-м, ці не значыць гэта, што на працягу адзінаццаці гадоў кафедра не мела ніводнага іншага значнага даследчага праекту? Грантавая заяўка друкуецца цалкам, таму ў кнізе можна бачыць асабістыя звесткі ўдзельнікаў праекту, у прыватнасці хатнія адрасы і тэлефоны, а таксама даведацца пра выніковую суму фінансавання праекту – 650 млн бел. руб. (каля 6 тыс. долараў на пачатак 1999 г.).

Уважлівы даследнік любы тэкст мусіць успрымаць як крыніцу веды, падбіраючы для кожнага асобную стратэгію прачытання. Рэцэнзаваная кніга, відавочна, уяўляе з сябе прэзентацыйнае выданне, нягледзячы на пастаўленую ва ўводзінах задачу і пазнаку «навуковае». Дакладней, гэта зборнік асобных дакументаў аб працы кафедры паліталогіі БДУ. Тым не менш, змест гэтых дакументаў дастаткова паказальны.

Па-першае, ён дэманструе высокую ступень ізаляванасці кафедры ад паліталогіі па-за яе межамі (за выключэннем, магчыма, Акадэміі кіравання) і ад акадэмічнай супольнасці Беларусі ў больш шырокім кантэксце. Пры гэтым праз выданне сістэмна праходзіць ідэя пра ўнікальнасць, цэнтральнае месца і вядучыя пазіцыі кафедры.

Па-другое, кніга паказвае амаль выключную засяроджанасць кафедры на выкладанні, навучальным працэсе і адукацыйнай дзейнасці. Прасачыць значную (для калектыву такога памеру) навуковую дзейнасць нам, на жаль, не ўдалося, як і вызначыць даследчы профіль кафедры. Магчыма, гэта звязана з тым, што выданне не поўнае і не ўтрымлівае дадатковай істотнай інфармацыі, а частка змешчаных звестак ужо састарэла. Але ж у гэтай рэцэнзіі мы зыходзім толькі з тэксту, які не дае падставаў для больш пазітыўнай інтэрпрэтацыі ды выклікае адпаведныя развагі пра стан палітычнай навукі ў Беларусі.

**Літаратура**

1. Агеев, В.В. (1997). *Интеграция стран Западной Европы: политический процесс*. Калининград: Калининградский государственный технологический университет.
2. Агеев, В.В. (2001). *Развитие европейского федерализма*. Калининград: Калининградский юридический институт МВД РФ.
3. Землякоў, Л.Я. (1996a). *Беларусь на шляху да свабоды сумлення*. Менск: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
4. Землякоў, Л.Я. (1996b). *Рэлігія і грамадства*. Менск: Вышэйшы каледж сувязі.
5. Матусевич, Е.В. (2005). *Национально-государственные интересы Республики Беларусь в контексте процесса глобализации*. Минск: ИНБ Республики Беларусь.
6. Решетников, С.В. (2003). *Теория принятия управленческих решений*. Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь.
7. Решетников, С.В., Антанович, Н.А., Ляхович-Петракова, Н.В. (2009). «Политическая наука в Республике Беларусь: проблемы и перспективы», *Вестник БГУ.* Сер. 3, 2009. № 1: 80-86.